# СВАБОДА

НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА — № 30 (45), 23 – 29.11. 2006 г.


# ЕЎРАСАЮЗ ХОЧА ДАЦЬ БЕЛАРУСІ ШАНЕЦ

## БРУСЕЛЬ ПРАПАНУЕ ВЫГОДЫ Ў АБМЕН НА ДЭМАКРАТЫЮ

21 лістапада адначасова ў Мінску і Брусэлі быў абнародаваны дакумент, у якім фармулюецца новая палітыка Еўрасаюза ў дачыненні да Беларусі. У дакуменце гаворыцца аб перавагах, якія можа мець наша краіна ў выпадку, калі яна пойдзе шляхам дэмакратызацыі: будуць вызваленыя ўсе палітзняволеныя, адбудуцца сапраўды свабодныя і справядлівыя выбары, улады пачнуць шанаваць правы чалавека.

Еўрапейскі камісар у справе знешніх стасункаў Беніта Ферэра-Вальднер, якая прэзентавала дакумент у Брусэлі, сказала ў сваім выступе: «Народ Беларусі мае права ведаць, што ён губляе».

У Мінску дакумент прадстаўляў кіраўнік кіеўскага офіса Еўракамісіі Іен Боўг, а таксама паслы краін Еўрасаюза. Перад гэтым Боўг наведаў МЗС Беларусі і Адміністрацыю прэзідэнта, дзе перадаў іх прадстаўнікам афіцыйныя дакументы. Паводле Іена Боўга, Еўрасаюз зробіць усё магчымае, каб пра яго прапановы даведалася як мага больш людзей у Беларусі.

У дакуменце прыводзяцца канкрэтныя прыклады таго, якую карысць народ Беларусі можа атрымаць ад збліжэння з ЕС у рамках Еўрапейскай палітыкі добрасуседства (ЕПД).

Навіна аб тым, што Еўрапейская камісія (урад Еўрапейскага саюза) рыхтуецца перадаць афіцыйнаму Мінску пасланне, у якім фармулюецца новая палітыка да Беларусі, з'явілася напярэдадні ў панядзелак і стала сапраўднай палітычнай сенсацыяй. Яна адразу выклікала шмат водгукаў – як з боку афіцыйнага Мінска, гэтак і з боку апазіцыі. Старшыня палаты прадстаўнікоў Вадзім Папоў назваў прапанову "палітыкай дыктату" і "вуліцай з аднабаковым рухам". Лідэры апазіцыі, наадварот, убачылі ў гэтым дэманстрацыю таго, што Беларусі ёсць месца ў сучаснай Еўропе. Аляксандр Мілінкевіч, напрыклад, сказаў у інтэрв'ю Радыё Свабода: "Для цвярозай улады гэта – вялікі шанец для развіцця эканомікі, для вырашэння праблемаў, якія ёсць у Беларусі. Ці скарыстаецца ўлада з гэтага? Яна павінна зразумець, што дэмакратыя – гэта не проста пажаданне пэўнай часткі насельніцтва нашай краіны, а ўмова ўваходу нашай краіны ў цывілізаваны свет… Але вельмі важна, каб Еўрасаюз паводзіў сябе паслядоўна і не даваў магчымасцяў беларускай уладзе ўвесці сябе ў зман".



**Іен Боўг,** *кіраўнік прадстаўніцтва Еўракамісіі ў Беларусі і Украіне, падчас прэс-канферэнцыі. Мінск, 21 лістапада 2006 году.*

Значная частка беларускіх палітыкаў і экспертаў упэўненая, што Лукашэнка і яго паплечнікі ніколі не пойдуць на ўмовы Брусэля, і што чакаць хуткага вызвалення ўсіх палітычных зняволеных з турмаў, а таксама свабоды слова і сходаў пакуль не даводзіцца.

**Працяг на стар. 4**

## БЕЛАРУСЬ-РАСІЯ: НАВІНЫ З ФРОНТУ

► СТАР. 5

## ПОЎНЫ «АПОФЕГЕЙ» ЭСЭ АЛЕГА АБЛАЖЭЯ

► СТАР.7

# ЧАГО СЁННЯ НЕ ХАПАЕ Ў ГАЗЕТАХ – ДЗЯРЖАЎНЫХ І НЕДЗЯРЖАЎНЫХ?

**КРЫСЦІНА ШАЦІКАВА, ГРАМАДСКАЯ АКТЫВІСТКА:**

## “У ГАЗЕТАХ УСЁ ВЕЛЬМІ ПАЛІТЫЗАВАНА”

Калі ўзяць афіцыйныя газеты, то там пішуць так, што я адразу ведаю – насамрэч усё адбываецца абсалютна па-іншаму. А ў незалежных газетах ёсць толькі палітычная праўда. У нас усё вельмі палітызавана. А хацелася б, каб газета адлюстроўвала рэчаіснасць не толькі палітычную, а яшчэ і агульначалавечую.

**ІГАР, МЕДЫК:**

## “НЯМА ГУЧНЫХ СЕНСАЦЫЙНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ”

Нідзе няма гучных сенсацыйных матэрыялаў, нейкіх журналісцкіх расследаванняў, пасля якіх газета перадаецца з рук у рукі. Якую зараз газету можна камусці перадаць са словамі: “Там такое напісана!…”? Няма такіх сёння. А былі.

**СТАНІСЛАЎ ШУШКЕВІЧ, КІРАЎНІК БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ 1990-Х:**

## “НЕ ХАПАЕ ІНФАРМАЦЫІ”

У нас вельмі вузкае кола тых персон, пра якіх пішуць і гавораць. Хацелася б, каб гэта было крышку шырэй. І наогул не хапае кароткіх і змястоўных матэрыялаў. Шмат вялікіх артыкулаў, у якіх доўга шукаеш сэнс. Пакуль выціснеш ваду, яны зморваюць. Мне вельмі цяжка іх чытаць. А на іх мода нейкая пайшла – і ў “Народнай волі” і ў “Нашай Ніве”. Вельмі часта праблему смокчуць з пальца. Не хапае праўдзівай інфармацыі і журналісцкага розуму.

**ВОЛЬГА, ХАТНЯЯ ГАСПАДЫНЯ:**

## “НЕ ХАПАЕ ЯРКАСЦІ, ІРАНІЧНАГА СТЫЛЮ, ГУМАРУ”

Сёння не хапае яркасці. Іранічнага стылю. Гумару. А гэта ўсё ў нас было. Узгадайце “Свабоду”, “Белорусскую деловую”, тыднёвік “Имя». Пра дзяржаўныя выданні увогуле няма чаго казаць.

**АНАТОЛЬ ЛЯЎКОВІЧ, ПАЛІТЫК:**

## “НЕ ХАПАЕ САМІХ ГАЗЕТ”

Дзяржаўных газет – аж занадта, а незалежных не хапае. Гэта самае галоўнае. І пажадана, хоць гэта і немагчыма, каб у афіцыйных газетах хоць нейкі альтэрнатыўны пункт гледжання гучаў. Таму што без гэтага рухацца наперад нельга. Гэта пасыл Якубовічу і іншым. А нашых газет вельмі мала, ды яшчэ яны не маюць ног для распаўсюду. Гэта, вядома, дзікунства.

**АЛЯКСЕЙ, СЛУЖБОВЕЦ:**

## “НЕ ХАПАЕ БЫЛОЙ “СВАБОДЫ”

Мне не хапае ранейшай газеты “Свабода”. За ўсю нашую апошнюю гісторыю гэта была адзіная газета, якую я чытаў ад коркі да коркі. Там было ўсё, чаго хацелася. І цікавыя навіны, і бліскучая аналітыка і геніяльныя фотарэпартажы. Чаму такое выданне немагчымае зараз, не ведаю. Напэўна, таму, што тады ў грамадстве была энергія, якая зараджала і палітыкаў, і прэсу. Сёння паўсюль пануе апатыя. Таму я сёння чытаю не газеты, а літаратурную класіку.

**РЫГОР СІТНІЦА, МАСТАК:**

## “НЕ ЗАДАВАЛЬНЯЮЦЬ НІЯКІЯ ГАЗЕТЫ”

Скажу шчыра. Беларускія газеты мяне не задавальняюць аніякія. Чаму не задавальняюць афіцыйныя – зразумела. Цікавай інфармацыі для сябе я там амаль не знаходжу. Хаця ў той жа “Саўбелцы” часам можна цікавае знайсці, дзякуючы Рублеўскай. Могуць на паласу даць нешта пра пісьменнікаў, пра Сапегу, як гэта ні дзіўна. А чаго мне канкрэтна не стае ва ўсёй беларускай прэсе, дык гэта аналітыкі. Я вельмі люблю аналітычныя матэрыялы, і гэтага мне заўсёды не хапае. У “Народнай волі” гэтага зусім няма. У электроннай прэсе тая ж самая карціна. І абсалютна адсутнічае інфармацыя пра мастацкае жыццё. Яго быццам няма. А калі ёсць нейкая інфармацыя ў той жа “Нашай Ніве”, дык вельмі абмежаванае кола людзей патрапляюць у інфармацыйнае поле. Скажам так – свае людзі. Уся літаратура – гэта Глёбус. І ўся музычная культура – гэта Вольскі. Усё. Што тут казаць? Мы правялі нядаўна шыкоўную выставу графікі. І дзе пра яе напісана? Нідзе.

**ВАСІЛЬ, ПРАДПРЫМАЛЬНІК:**

## “НЯМА ШТОДЗЁННАЙ БЕЛАРУСКАЙ ГАЗЕТЫ”

Мне не хапае ўсяго. Сур’ёзнай аналітыкі. Пашыранай падачы навінаў. Мне не хапае дробных мясцовых навінаў. “Каб ведаць, што робіцца ў месцы, дзе я жыву, дастаткова чытаць мясцовую газету”. У нас гэта немагчыма. Функцыю штодзённай газеты не выконвае ніводнае беларускае выданне. Ёсць што пачытаць у “Нашай Ніве”, але гэта ў прынцыпе не газета. У яе крыху іншы фармат. Яе бліжэйшыя аналагі – гэта амерыканскі “Нью-Йоркер” ці расійскі “Огонек”. Гэткі літаратурна-публіцыстычны часопіс. Чытво для разумных людзей.

**АЛЕСЬ АНЦІПЕНКА, ФІЛОСАФ:**

## “НЕ ХАПАЕ ГАЛАСОЎ ЛЮДЗЕЙ”

Мне не хапае ведання рэальнага жыцця па-за Мінскам. Напрыклад, ці сумуюць людзі ў Пінску з-за таго, што да іх даўно не прыязджаў Купалаўскі тэатр? Ці цікавіць іх творчасць НРМ? Мне не стае інфармацыі, што адбываецца ў нашых гарадах. У афіцыйных газетах нам у асноўным распавядаюць пра аграгарадкі і ўраджаі. А паміж вёскай і сталіцай проста інфармацыйная пустыня. Яшчэ мне не хапае галасоў людзей. Самых розных сацыяльных приступак і прафесій. Што яны думаюць наконт таго ці іншага? Прычым не абавязкова пра палітыку. Па-трэцяе, журналісты проста дасталі сваімі мудрымі разважаннямі. Яны займаюць пазіцыю нейкіх менеджэраў жыцця, аракулаў, прарокаў. На халеру мне іхныя прароцтвы? Чаму нашы медыі абсалютна не звяртаюцца па экспертаў? Ёсць нейкая праблема – апытайце экспертаў. Хай яны робяць ацэнкі і прагнозы.

# МІКОЛА АСТРЭЙКА: "Я ЯШЧЭ НЕ ДА КАНЦА ВОЛЬНЫ ЧАЛАВЕК"

17 лістапада нечакана быў вызвалены з турмы Мікола Астрэйка. Сёлета ў жніўні ён быў асуджаны судом Цэнтральнага раёна Мінска на два гады зняволення за "дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі".

Размова вялася пра грамадскую арганізацыю "Партнёрства", сябры якой меліся назіраць за прэзідэнцкімі выбарамі. Разам з Астрэйкам былі асуджаныя Валеры Дранчук (ён атрымаў год турмы), Аляксандр Шалайка і Эніра Браніцкая. Яны былі вызваленыя пасля суду, адседзеўшы перад тым некалькі месяцаў на Валадарцы.

Адразу па выхадзе з турмы Мікола Астрэйка даў інтэрвью "Нашай Ніве", у якім, у



**Мікола Астрэйка** *па выхадзе з турмы. Мінск, 20 лістапада 2006-га году.*

прыватнасці, паведаміў:

"Натуральна, што было вельмі і вельмі цяжка. Гэта тычылася абсалютна ўсяго. Спадзяюся, турма не адбілася значна на маім здароўі, але ўсё адно бліжэйшым часам мяркую звярнуцца да лекараў, па медагляд. У мяне хранічная хвароба сэрца. А таксама, як ва ўсіх зэкаў, у мяне баляць зубы, таму неабходна ісці да стаматолага…Я яшчэ не да канца вольны чалавек. Буду працаваць на папраўчых працах і 15% заробку адлічаць дзяржаве. У панядзелак зранку быў у РАУС Першамайскага раёна Мінску, стаў на ўлік. Думаю, што бліжэйшымі днямі знайду для сябе нейкую працу. Галоўнае – што я буду жыць разам з сям'ёй".

На волі Мікола Астрэйка ўпершыню змог пабачыць сваю дачку Лізу, якая нарадзілася пасля ягонага арышту.

# ПАКАРАННЕ І ЎЗНАГАРОДА

Міністэрства інфармацыі РБ вынесла папярэджанне "Нашай Ніве" – адзінай беларускамоўнай недзяржаўнай газеце. Адначасова прыйшла вестка аб тым, што галоўнаму рэдактару тыднёвіка Андрэю Дыньку ў Галандыі прысуджана міжнародная прэмія "Свабода выказвання".

Папярэджанне за подпісам намесніка міністра Ліліі Ананіч было вынесенае 16 лістапада за тое, што ў выходных звестках выдання «не ўказваецца сапраўдны адрас рэдакцыі, што з'яўляецца парушэннем артыкула 26 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі». Як паведаміла Беларуская асацыяцыя журналістаў, сёлета рэдакцыі «Нашай Нівы» чатыры разы адмаўлялі ў арэндзе памяшкання, таму ў яе не было рэальнай магчымасці вырашыць пытанне аб юрыдычным адрасе. У красавіку «Наша Ніва» атрымала ліст аб адмове ў рэгістрацыі на тэрыторыі сталіцы ад намесніка старшыні мінгарвыканкама Ціцянкова, у якім сцвярджалася, што «размяшчэнне газеты «Наша Ніва» ў горадзе Мінску немэтазгоднае». Гарвыканкам матываваў сваё рашэнне тым, што галоўны рэдактар газеты Андрэй Дынько падвяргаўся адміністрацыйнаму арышту. (Дынько быў затрыманы сёлета 21 сакавіка, падчас паслявыбарчых пратэстаў на Кастрычніцкай плошчы сталіцы, а пасля асуджаны, сярод дзясяткаў іншых, па абвінавачванні ў «нецэнзурнай лаянцы».)



Наша Ніва

**100 гадоў таму, 23-га лістапада 1906 году выйшла ў свет першая беларуская газета «Наша Ніва», якая фактычна стварыла нашу сучасную нацыю і краіну, мову і культуру. З «Нашай Нівы» выйшлі класікі беларускай літаратуры: Янка Купала і Якуб Колас, Максім Багдановіч і Максім Гарэцкі, Алесь Гарун і Змітрок Бядуля. Сённяшняя «Наша Ніва» працягвае традыцыі сваёй славутай папярэдніцы.**

Між тым, днямі галоўны рэдактар «Нашай Нівы» стаў лаўрэатам штогадовай прэміі «Свабода выказвання». Прэмію прысуджаюць Міжнародны ПЭН-Клуб і нідэрландскі фонд «Oxfam Novib». Апрача рэдактара «НН», сёлета яе атрымалі яшчэ чатыры чалавекі: Сымон Мол (Камерун/Польшча), Роя Талаўі (Іран/Курдыстан), Фарадж Байракдар (Сірыя) і Грант Дзінк (Турцыя).

Цырымонія ўзнагароджвання адбылася 18 лістапада ў Гаазе. Андрэй Дынько на ёй не прысутнічаў.

Варта адзначыць, што абедзве падзеі адбыліся ў пярэдадзень 100-гадовага юбілея першай беларускай газеты "Наша Ніва".

## Суседзі

# АБРАМОВІЧ ПРЫЕДЗЕ Ў ТАЎРОГІ

Літоўскі горад Таўрогі рыхтуецца да візіту расійскага міліярдэра Рамана Абрамовіча. Менавіта ў Таўрогах перад другой сусветнай вайной жылі дзяды, бацькі і іншыя сваякі найбагацейшага чалавека Расіі і Вялікабрытаніі.

Акурат налета Таўрогі, у якіх жыве 53 тысячы чалавек, адзначаць свае 500-я ўгодкі. На юбілей прыедуць першыя асобы дзяржавы. Для рэкламы горада мяркуецца выкарыстаць і сваяцкія сувязі Рамана Абрамовіча. Вуліца, на якой жыла сям'я Абрамовічаў, сёлета была ў хуткім тэмпе адрамантаваная. Аднак віцэмэр горада Арунас Гендролюс абвяргае чуткі, што сюды ўжо прыязджалі прадстаўнікі міліярдэра: "Гэта была каманда расійскага тэлебачання, якая рыхтавала вялікі рэпартаж пра мясціны паходжання Абрамовіча. Напэўна, іх і прынялі за прадстаўнікоў алігарха".

Тым не менш, мэр Таўрогаў Пранас Пятрошус заявіў, што запрашэнне Абрамовічу адпраўлена і ад яго атрымаць станоўчы адказ.

Перад вайной у Таўрогах жыла вялікая габрэйская супольнасць. "Заможная сям'я Абрамовічаў жыла ў доме на Рэспубліканскай вуліцы, 2 да 14 чэрвеня 1941 году, калі была вывезена ў ссылку ўглыб Расіі", — кажа віцэмэр Гедролюс. Там, у Сібіры, у 1966 годзе і нарадзіўся Раман.

Пра канкрэтныя прапановы мэры Таўрогаў да міліярдэра кіраўнікі горада казаць ухіляюцца. Маўляў, мы яшчэ не ведаем, ці ён увогуле цікавіцца гісторыяй сваёй сям'і і зямлёй продкаў. Не вядома таксама, ці ён чалавек сентыментальны і ці зацікаўлены інвеставаць у Таўрогі.

Святкаванне юбілею ў Таўрогах адбудзецца 22-24 чэрвеня 2007 году.

**Віленчук**

# ЕЎРАСАЮЗ ХОЧА ДАЦЬ БЕЛАРУСІ ШАНЕЦ

## БРУСЕЛЬ ПРАПАНУЕ ВЫГОДЫ Ў АБМЕН НА ДЭМАКРАТЫЮ

**(Пачатак на стар.1)**

"Прапановы і патрабаванні Еўрапейскага Саюза"(так называецца дакумент, прадстаўлены Еўракамісіяй) складаюцца з дзьвюх частак: "Што Еўрапейскі Саюз можа даць Беларусі" і "Што ўрад Беларусі можа зрабіць"

### ШТО ЕС МОЖА ДАЦЬ БЕЛАРУСІ

*"Калі Беларусь стане паўнапраўным удзельнікам нашай палітыкі добрасуседства і такім чынам паўнапраўным партнёрам ЕС,* — гаворыцца на самым пачатку дакумента — *ЕС зможа дапамагчы палепшыць якасць жыцця беларусаў".*

Еўракамісія ў сваім пасланні пералічвае сферы магчымага супрацоўніцтва. Гэта, напрыклад, падтрымка ў развіцці малога і сярэдняга бізнесу, што стварыла б у Беларусі больш працоўных месцаў і *"забяспечыла лепшыя перспектывы для маладога пакалення"*. Гэта паляпшэнне сістэмы аховы здароўя і адукацыі, мадэрнізацыя транспартнай і энергетычнай сістэмы, паляпшэнне ўмоваў працы экалогіі і г.д.

ЕС абяцае спрасціць кантакты беларускіх грамадзянаў з краінамі Еўропы, у тым ліку выезд за мяжу праз суседнія краіны.*"Мы прапанавалі б беларускім студэнтам больш стыпендыяў для навучання ва ўніверсітэтах ЕС. Мы б заахвочвалі рэгулярныя і доўгатэрміновыя абмены і ўстойлівыя адносіны паміж беларускімі ўніверсітэтамі і ўніверсітэтамі ЕС на ўсіх узроўнях…"* – гаворыцца ў дакуменце.

**У якасці ўмоваў для супрацоўніцтва Еўрасаюз выстаўляе 12 асноўных патрабаванняў да ўладаў Беларусі**



**Паслы краінаў** *Еўрасаюза на мемарыяльным комплексе «Яма». Мінск, 20 лістапада 2006 году. За тыдзень да гэтага мемарыял на месцы масавага расстрэлу габрэяў гітлераўцамі быў апаганены фашысцкай свастыкай. Кіраўніцтва Беларусі ніякім чынам не адгукнулася на акт антысемітызму. Вінаватыя не знойдзеныя.*

Еўрасаюз абяцае лепшы доступ для беларускіх прадуктаў да рынку ЕС з яго 480-ю мільёнамі спажыўцоў, *"што дапамагло б павялічыць рост беларускага гандлю і істотна ўзмацніла б далейшае эканамічнае развіццё краіны,… асабліва ў тэкстыльным сектары Беларусі…"*

На думку аўтараў паслання, калі Беларусь уступіць ва Ўсясветную Гандлёвую Арганізацыю, гэта павялічыць магчымасці экспарту беларускіх прадуктаў у свеце, у тым ліку і ў краіны ЕС.

Але пры гэтым яго аўтары падкрэсліваюць, што палітыцы добрасуседства ў адносінах да Беларусі перашкаджае аўтарытарны рэжым Аляксандра Лукашэнкі, *які "пазбаўляе сваіх грамадзян фундаментальных дэмакратычных правоў. Народ Беларусі - самая першая ахвяра ізаляцыі, навязанай яму афіцыйнай уладай, але ён жа будзе першым, хто скарыстаецца перавагамі прапановаў для дэмакратычнай Беларусі".*

### ШТО ЎРАД БЕЛАРУСІ МОЖА ЗРАБІЦЬ

У якасці ўмоваў для супрацоўніцтва Еўрасаюз выстаўляе 12 асноўных патрабаванняў да ўладаў Беларусі. Сярод іх: паважаць права народа выбіраць сваіх лідэраў дэмакратычным шляхам; паважаць права народа Беларусі на незалежную інфармацыю, не зачыняць газеты і не перашкаджаць іх распаўсюджванню; паважаць правы недзяржаўных арганізацый і больш не ўскладняць іх легальнага існавання. Далей цытата: *"вызваліць усіх палітычных зняволеных - сяброў палітычных апазіцыйных партый, сяброў недзяржаўных грамадскіх арганізацыяў і простых грамадзян, арыштаваных падчас мірных дэманстрацый і мітынгаў; належным чынам і незалежна расследаваць або перагледзець выпадкі са знікненнем людзей".*

Таксама Еўрасаюз патрабуе:

— забяспечыць права беларусаў на незалежную і непрадузятую судовую сістэму - з суддзямі, незалежнымі ад палітычнага ціску, без самаўпраўства і галаслоўнага крымінальнага пераследу або палітычна матываваных судовых прысудаў, без зняволення грамадзянаў, якія мірна выказваюць свой пункт погляду;

— спыніць адвольныя арышты і затрыманні, дрэннае абыходжанне з людзьмі;

— паважаць правы і свабоды беларускіх грамадзянаў, якія адносяцца да нацыянальных меншасцяў.

Улады РБ павінны паважаць паважаць правы беларускіх працаўнікоў і незалежных прафсаюзаў; далучыцца да скасавання смяротнага пакарання.

На завяршэнне паслання Еўрапейскі Саюз абяцае працягнуць фінансавую дапамогу рэгіёнам Беларусі, якія пацярпелі ад Чарнобыльскай катастрофы. Акрамя таго, як адзначаецца ў дакуменце, Еўрасаюз *"працягне падтрымліваць друкаваную прэсу і трансляванне незалежных тэле- і радыёпраграм для Беларусі. ЕС таксама будзе вітаць і забяспечваць фінансавую падтрымку беларускім студэнтам, якія навучаюцца ва ўніверсітэтах Еўропы".*

# АПОШНІ АРГУМЕНТ

## НАВІНЫ ПРА ДАЧЫНЕННІ «САЮЗНІКАЎ» НАГАДВАЮЦЬ ЗВОДКІ З ФРОНТУ

Пад Оршай мытнікі спынілі некалькі дзясяткаў фураў з расійскімі цукеркамі. "Газпром" пагражае спыніць пастаўкі газа ў Беларусь з 1 студзеня. Вось дык саюзнікі!

"Газпром" ужо не прапануе набыць "Белтрансгаз", а патрабуе, каб яму прадалі гэта стратэгічнае прадпрыемства. Калі дамоўленасць не будзе дасягнутая, расійскі "Дзед Мароз" можа замест падарунка пакінуць Беларусь без газа. На гэта празрыста намякнуў прэсавы сакратар "Газпрома" Сяргей Купрыянаў. Цікава, што ў звязку з гэтым ён параўнаў Беларусь з Грузіяй. Прычым паралель аказалася на карысць Грузіі, з якой Расія знаходзіцца ледзь не ў стане вайны. Аднак Купрыянаў мяркуе, што дамовіцца з каўказскай краінай будзе прасцей, чым з Беларуссю.

Адначасова Масква ціснe на Мінск і з дапамогай нафты. Пастаўкі сыравіны на Наваполацкі ды Мазырскі нафтаперапрацоўчыя заводы ўжо скарочаныя. Кіраўніцтва Расіі патрабуе, каб Беларусь, па-першае, істотна падвысіла экспартнае мыта, а па-другое, аддавала 85% яго ў Маскву. Размовы на гэты конт доўжацца ўжо шмат часу. Цяпер, каб не марудзіць, Расія пагражае пакінуць Беларусь не толькі без нафты, але і без газа.

У Лукашэнкі няшмат магчымасцяў супрацьстаяць пагрозам. За апошнія 12 год нічога не зроблена, каб разнастаіць (дыверсіфікаваць) крыніцы атрымання энерганосьбітаў. Улады РБ атрымлівалі з Расіі танныя газ і нафту і лічылі, што так будзе заўсёды. Таму цяпер яны ў разгубленасці. Спробы тэрмінова знайсці альтэрнатыўных пастаўшчыкоў нафты выглядаюць наіўнымі. Прыкладам, на мінулым тыдні з'явілася інфармацыя, што Беларусь збірацца купляць нафту ў Казахстане. Аднак дастаўляць яе ў Мазыр і Наваполацк усё адно давядзецца праз Расію. А тая ўжо заявіла, што яе чыгунка перагружаная, і не ў стане транспартаваць нафту ў Беларусь (зусім як нашы друкарні адмаўляюцца друкаваць незалежныя газеты). У выніку на казахскім варыянце давялося паставіць крыж.

Наўрад ці што атрымаецца і са спробаў здабыць нафту з Ірана ці Венесуэлы. Гэтыя экзатычныя варыянты перад усім патрабуюць часу, а ўсходні сусед грозна грукаецца ў дзверы ўжо цяпер. Таму давядзецца шукаць іншае выйсце.

Захады наконт адвечнага славянскага братэрства ўжо не працуюць. Фактычна ў Лукашэнкі застаўся адзін істотны аргумент – вайсковае супрацоўніцтва. Тут кан'юнктура складваецца для яго няблага, паведамляе тыднёвік "Беларусы і рынак". Расія надта нярвуецца з-за таго, што ў Польшчы паціху размяшчаецца тактычная авіяцыя НАТО. "Як дарэчы прыляцелі F-16", — адзначае аўтар артыкула Аляксандр Алесін.

Адказам Масквы мусіць стаць стварэнне адзінай рэгіянальнай беларуска-расійскай сістэмы супрацьпаветранай абароны. Гэты працэс ідзе да фіналу – чарговы ракетны комплекс С-300 трапіць на ўзбраенне беларускага войска ўжо на гэтым тыдні, аднак яго трэба яшчэ юрыдычна аформіць. Не рызыкуючы памыліцца, можна сцвярджаць, што Лукашэнка запатрабуе ад Расіі ўлічыць ягоную гатовасць да вайсковага супрацоўніцтва пры вызначэнні ўмоваў пастаўкі энерганосьбітаў у Беларусь.

Між іншым, беларускаму кіраўніку было б значна прасцей дамовіцца з расійскім калегам, каб не сапсаваныя асабістыя адносіны. Для Пуціна гэты чыннік мае сур'ёзную вагу. Кажуць, што канфлікт з Грузіяй выбухнуў менавіта з-за таго, што Міхаіл Саакашвілі зневажыў гаспадара Крамля.



belzhaba.com

Паводле гэтай версіі, падчас візіту ў Пецярбург грузінскі прэзідэнт падчас нейкай прыватнай гутаркі назваў Пуціна "Ліліпуціным". Натуральна, сцены мелі вушы. Пуціну данеслі словы Саакашвілі, і ён страшэнна пакрыўдзіўся. Што было далей, усе добра ведаюць.

Лукашэнка сцвярджае (апошні раз – 17 лістапада ў Бабруйску), што ў яго з Пуціным добрыя асабістыя стасункі. Але шмат што сведчыць пра адваротнае. Прыкладам, у свежым нумары "Белгазеты" блізкі да Крамля журналіст Мікалай Сванідзэ тлумачыць расійска-беларускі канфлікт менавіта дрэннымі адносінамі паміж кіраўнікамі дзвюх краін. Праблемы ўзніклі з-за таго, што сістэма дамоўленасцяў, на якую разлічваў Пуцін, не выконваецца. Няма ні саюзнай дзяржавы, ні адзінай валюты, і нават "Белтрансгаз" Расіі дагэтуль не прадалі, хоць абяцалі шмат разоў. "Пуцін адчувае сябе расчараваным, і, не выключаю, падманутым", — робіць выснову Сванідзэ.

Выглядае, што ў бліжэйшыя тыдні напружаная атмасфера на беларуска-расійскім накірунку захаваецца. Таму чакайце новых паведамленняў з франтоў.

**Валеры Філін**

# “МЫЛЬНЫЕ ПУЗЫРИ” І ПРАСТАТА

Саюздрук

## ЦІ ВЫГАДНА БЫЦЬ АПАЗІЦЫЯНЕРАМ?

Чым бліжэй чарговыя выбары, тым актыўней становіцца дзяржаўны клопат аб моладзі. Каб, не дай Бог, юныя мазгі не “атруціліся” ідэяй свабоднай Беларусі. Галоўны сённяшні ідэолаг Аляксандр Праляскоўскі ў “СБ” дзеліцца сваімі поглядамі на маладзёжную палітыку.

*“Один деятель так называемой оппозиции любит повторять, что «улады не ведаюць, куды далей ісці», а он знает: надо выводить людей на улицу. По пути ли молодежи с такими доктринерами? У власти, у государства уже сегодня сформированы планы до 2015 года и дальше. И в отношении молодежи действует программа до 2010 года. Причем в этой программе «Молодежь Беларуси» — целый комплекс направлений, по которым ведут работу не только государственные органы, не только министерства и ведомства, но и сама молодежь...”*

Мяне заўжды радуе выкарыстанне вышэйшымі чыноўнікамі беларускай мовы ў якасці ўяўнай цытаты. Асацыяцыя толькі адна. Белы каланізатар грэбліва выціскае з сябе пару словаў на мове брудных тубыльцаў. Чым, зрэшты, ён лішні раз падказвае той моладзі, якая яшчэ не гатовая прадаць сваё нацыянальнае “Я” за “особую государственную поддержку”, – з кім ёй сапраўды па дарозе. Але сумна, што такой моладзі мала. Для большасці маладых людзей, асабліва тых, хто толькі атрымлівае пашпарты, Лукашэнка – такі ж вечны, як сонца. Цікава, што там за планы ў Праляскоўскага на 2015 год? Зрэшты, калі ўлады ажыццявяць хаця б палову сваіх планаў, Беларусь атрымае ўнікальнае пакаленне. Людзей без нацыянальнасці, без гонару і без голасу.

А “Народная газета” намагаецца абудзіць у чытача зайздрасць.

*“Сегодня заокеанские спонсоры озабочены поисками и раскруткой новых «поп-звезд» от оппозиции. Один из продюсеров-заводчиков этой «фабрики звезд» господин Гамильтон из киевского офиса «Национального демократического института» (NDI) активно ищет таланты в регионах под лозунгом «Даешь свежую кровь!». Только вот при ближайшем рассмотрении оказывается, что в очереди «знакомые все лица».*

*К примеру, господин Шалайко, так и не состоявшийся как «узник совести». Однако Гамильтон по-прежнему ему верит, точнее, доверяет не только свои амбициозные планы по политическому переустройству Беларуси, но и самое дорогое – деньги.*

*...выгодно ли господину Шалайко быть оппозиционером? Разумеется. Обратимся, что называется, к первоисточникам.*

*В декабре 2005 года координатором белорусских программ (!) украинского представительства NDI Д. Гамильтоном по электронной почте был проведен инструктаж неофициальных представителей NDI.*

*Не ломайте голову, речь шла не о политике. Господин Гамильтон наставлял своих приверженцев, как распорядиться деньгами. «…И должен каждый хранить в сейфе как минимум 5 тысяч долларов. А как только означенная сумма уменьшится, то немедля направлять ему заявку о выделении дополнительных средств…»*

Шаноўныя грамадзяне. Тыя, хто дазволіў сабе пазайздросціць. Хто з вас хоча на халяву паправіць сваё фінансавае становішча? Калі ласка. Некалькі месяцаў “Валадаркі” (якія адседзеў Шалайка разам з сваімі сябрамі за ўздел у неафіцыйным назіранні за выбарамі перад тым, як суд выпусціў яго на волю) і ў вас – «деньги, дом в Чикаго, много женщин и машин». Няма жадаючых? Тады сядзіце далей у сваіх канурах, глядзіце БТ і чытайце «Народную газету».

У газеце “Рэспубліка” прадзюсер Віталі Прастата (цікава, на які склад трэба рабіць націск?) прыадчыняе заслону над тайнамі беларускага шоў-бізнесу. Вартае жалю відовішча адкрываецца за кулісамі.

*“Больших гастролей у наших исполнителей нет по одной простой причине: у белорусской публики нет к ним реального интереса. Репертуар слабый ... Это, кстати, действенный метод – выступления по воинским частям, детским домам и т.д. … Опять же, я недавно вернулся из тура по Беларуси, возил первое белорусское оригинальное шоу «Мыльные пузыри». Но дело в том, что мы ездили буквально в одни дни с Александром Малининым. Все билеты в областях на его выступления были раскуплены. Получилось, что половина наших концертов шла при заполненных на треть залах”.*

Цікава, пры якіх умовах я бы пайшоў на шоў з назвай “Мыльныя пузыри”? Напэўна, для гэтага трэба быць зваr’яцелым фанатам “Мыльных пузырей” ці мець пачуццё вечнага жыцця, каб так не цаніць рэдкія хвіліны жыцця ўласнага. І пасля гэтага прадзюсер мае нахабства скардзіцца на горкую долю? Мне ва ўсім гэтым балагане больш за ўсё шкада насельнікаў дзіцячых дамоў і воінскі часцей. У іх выбару няма. У адрозненне ад нас з вамі. У нас ёсць НРМ з Шалкевічам, якім, дзякуй Богу, не патрэбныя паслугі таварыша Прастаты.

**Алесь Канюціч**

# ХОЧАЦЦА МАЎЧАЦЬ І ДУМАЦЬ

Як робяцца хвалі

## АЛЬБО ЯК БЫ НАМ НЕ “ПРАКАПЯЛЮШЫЦЬ” ...

Сёння ў сваім аглядзе крытыкаваць не буду, а буду раздаваць віншаванні. Першае віншаванне – Міхасю Скоблу. Апошняя яго “Вольная студыя” на Радыё Свабода мяне ўразіла. Аўтар перадачы і ягоны герой, спадар Хурсік, асмеліліся зачапіць надта важную тэму, якая да нядаўняга часу была абсалютна забароненай: карныя акцыі савецкіх партызан супраць мірнага беларускага насельніцтва. Сапраўды, пра Хатынь мы ўсе добра ведалі, цяпер будзем ведаць пра вёску Дражына. Былі галасы сведкаў, цытаваліся дакументы – гучала вельмі перакапаўча. Пасля такой перадачы хочацца выключыць радыё і доўга маўчаць і думаць, а колькі яшчэ такой праўды адкрыецца нам, колькі яшчэ такіх вёсак...

Другое віншаванне – рэпартажу, які прагучаў у “Ранішняй Свабодзе” 20 лістапада – пра тое, як праганялі варон прэч ад прэзідэнцкага палаца. А то яны, бач, усчыняюць гарладрай і перашкаджаюць камусці думаць пра Беларусь. А яшчэ – пра тое, як зразалі кветкі з каштанаў вакол прэзідэнтуры, каб увосені каштаны не падалі на зямлю – барані бог, каму на галаву зваляцца – тэракт! Гэткі матэрыял больш красамоўна сведчыць пра тое, што робіцца ў Беларусі, чым рэпартажы пра разгон мітынгаў. Асабліва спадабаўся гучны голас варонаў у абарону сваёй свабоды.

Трэцяе “віншаванне” – Еўрапейскаму радыё. Вядучыя Галляш Валынец і Міла Котка ўжо некалькі разоў са смакам ужылі слова “пракапялюшылі”. Любы жарт, як вядома, пры паўтарэнні надакучвае. А з такім стаўленнем да беларускай мовы можна “пракапялюшыць” і права называцца беларускім радыё.

**Сяржук Вітушка**

# ПОЎНЫ "АПОФЕГЕЙ"

## ХТО НАС САПРАЎДЫ ДЗЕЛІЦЬ

З мяне сябры ўжо строяць кепікі. Бо я чытаю "Літературную газету". "Газета для вар'ятаў!" – кажуць.

А для мяне гэта барометр, які паказвае, што за працэсы адбываюцца ў вялізнай суседняй краіне. Ад якой мы, на жаль, усё яшчэ залежым, і пагроза "аб'яднання" ўсё вісіць над намі дамоклавым мячом. І не цікавіцца жыццём суседкі – хаваць, бы страўсу, галаву ў пясок.

Газета – перш за ўсё галоўны рэдактар. Які ён – такая й музыка.

У "перабудовачныя" часы ў часопісе "Юность" з'явілася аповесць маладога тады Юрыя Палякова "ЧП раённага маштабу". Якая гэта была аплявуха камсамолу! Як ён здзекваўся з савецкай сістэмы ў наступных кнігах...

Сёння Юрый Палякоў – галоўны рэдактар "ЛГ". І цяпер у сваёй газеце ён друкуе аўтараў, якія пішуць так: *"...наш народ попрал вселенскую смерть и воскрес в форме могучего и в основе своей справедливого СССР"* (Ю.Крупнов, №45, 2006). Або А.Праханаў: *"После краха СССР у русских людей почти не осталось оплота. Началось великое Либеральное Иго, когда палачи убивали русскую культуру, глушили русскую память..."*

Бывае такі стан у прыродзе – яшчэ свеціць сонца, але неўпрыкмет, спакваля засцілаецца неба адразу лёгкімі перыстымі воблачкамі, потым усё менш і менш прасветаў, і ўрэшце ўвесь небасхіл зацягваецца, бы вока бяльмом, брудна-шэрай павалокай.

Так і "ЛГ". Яшчэ з'яўляюцца ад часу да часу тэксты талковых людзей кшталту Льва Анінскага, Алы Латынінай ды пары-тройкі іншых. Але іх галасы патанаюць у хоры "патриотов-державников", што пяюць пра "богоизбранность России".

На самым пачатку свайго рэдактарства Ю.Палякоў заявіў, што газета будзе прытрымлівацца пазіцый "просвещенного патриотизма".

Але гэта непазбежна – "здаровы" патрыятызм пераражаецца ў "здаравенны".

З нумара ў нумар "муссируются" дзве тэмы: 1) "Святая Православная Российская Держава"; 2) "Её заклятые, извечные враги – тлетворный развращенный Запад". Захад – гэта перш за ўсё ЗША, якія шчодра аплочваюць "падрыўную работу", і Ватыкан, які імкнецца аслабіць праваслаўе.

Тон задае былы "прораб перестройки" Аляксандр Цыпко, які цяпер стаў "православным державником" і ў вялізных, на ўсю паласу, артыкулах "дае чаду" гнюсным "лібералам", ад якіх усё зло "на Руси великой".

Праваслаўныя выказваюцца і наўпрост. Вось, напрыклад, адзін з галоўных ідэолагаў РПЦ, дыякан Андрэй Кураеў. У сваім інтэрв'ю ён выказаў шкадаванне, што ў Візантыі не знайшлося палымянага прапаведніка праваслаўя, роўнага прароку Мухамаду. У выніку арабы перайшлі ў іслам. А шкада, бо яны – "рэлігійна таленавіты народ". Відаць, іншыя народы, што далі свету "Сікстынскую мадонну", саборы ў Шартры, Рэймсе і Барселоне, геніяльную духоўную музыку ад грыгарыянскіх харалаў да Баха, падаюцца айцу Кураеву недастаткова "рэлігійна таленавітымі". А ў чым жа талент любых яму арабаў? У 11-м верасня? У "карыкатурнай вайне"? У зарэзаных каталіцкіх мнішках?

"Нянавісць "истинно православных" да "латинян" – спрадвечная. Вось што пісаў святы Феадосій, ігумен Пячорскага манастыра ў XI ст., — заклікаў ён у "Слове о вере христианской "латинской" — *"нравов их гнушаться... не брататься с ними, ни кланяться им, ни целоваться... Всё это потому, что неправильна вера их, и нечисто они живут: едят с собаками и кошками, и пьют свою мочу, едят черепах и диких коней, и ослов, и удавленину, и мертвечину..." – і так далей. То "святы чалавек"* так пісаў, чаго ж ад простых смяртэльнікаў чакаць?

Жыў бы цяпер – быў бы сярод аўтараў "ЛГ".

Здавалася б, адносіны такой "праваслаўна"-накіраванай газеты да былога СССР, дзе руйнаваліся храмы, дзе атэізм набыў самыя дзікія формы, святароў катавалі, расстрэльвалі, тапілі ў палонках, гнаілі ў ГУЛАГУ, – павінны быць адназначна негатыўнымі. Але дзе там! "СССР, соответствовавший по территории исторической Росии... на деле являлся Большой Россией. Коммунистическая идеология СССР не имела при этом особого значения" (Ю.Крупнов). Гэта ў СССР камуністы нічога не значылі!

No comment, як кажуць на "растленном Западе".

Проста ашаламляе, як можа таленавіты літаратар у сваім рэдакцыйным "катле" варыць такую нястраўную кашу-размазню, дзе мяшаецца ўсё – камунізм з праваслаўем, "царь-мученик" і "идеальный советский руководитель" Брэжнеў...

А вось якія кнігі рэкамендуюцца да прачытання: "Ю.Петухов. Сверхэволюция и Высший Разум Мироздания. Суперэтнос Русов: от мутантов к богочеловечеству" (серия "Подлинная история"). І цытата адтуль: *"Развивается (развёртывается) в пространстве только сам суперэтнос русов. Все вычленившиеся сыновние и дочерние этносы обречены на гибель или постепенное угасание-инволюцию".*

А яшчэ адна: "Владимир Карпец. Русь Меровингов и корень Рюрика (Оклеветанная Русь)": *"Древние франки и русы-приамиды – один народ, вышедший когда-то из легендарной Трои... Установление власти Рима и Каролингов над Европой породило первый в ее истории геноцид: под корень... уничтожались народы, не желавшие принимать Римо-католичество... Романо-германская, латинская культура была в буквальном смысле построена на костях исконных народов Европы и ее законных царей..."*

Калі гэта не праваслаўна-расійскі нацызм, то – што?

Відаць, нічому не навучыў лёс дзеячоў, што ўжо ўздымалі сваю нацыю "юбер аллес"...

Уражвае і неверагоднае "дурновкусие" гэтага "патрыятычнага" кічу. А паэзія? – друкуецца любое графаманства, абы былі рыфмы кшталту "Русь – молюсь", абы пачавала да падборкі тыпу "Ещё звонят в Святой Руси колокола".

От сельской древней колокольни
Дорог, тропинок кисея
Ведёт к Москве первопрестольной
Россию – матушку всея.

О, краіна Мандэльштама, Пастэрнака і Бродскага! Але не, то ж былі "иудеи".

Словам, "апофегей" цемрашальства, калі ўжыць тэрмін, створаны самім Ю.Паляковым.

"Велика есть" таямніца пераражджэння. І не з Саула ў Паўла, а – наадварот.

Памятаю, у 1991 годзе прыязджаў у Вільню, каб падтрымаць літоўцаў разам з цяпер ужо нябожчыкам Ягорам Якаўлевым, рэдактарам газеты "Московские новости" адзін з найбольш яркіх публіцыстаў Андрэй Нуйкін.

Сёння ён у "ЛГ" падтрымлівае паляванне на "грузінскіх вядзьмарак".

Іншы аўтар цешыцца, што ўжо няма "кепскай грузінскай мінералкі" і "сярэдняга малдаўскага віна".

Улада сказала "фас!", і кінулася зграя.

І яны лічаць сябе інтэлігентамі, нашчадкамі Чэхава і Караленкі...

А яшчэ – кожны дзясяты-дванаццаты аўтар лічыць абавязковым спаслацца на "талантливую книгу (статью) Ю.Полякова". І сціплы Ю.Палякоў гэта друкуе...

І – трэцяя тэма! Такая вялікая, што спатрэбілася ўтварыць цэлы дадатак "Лад" – бач, не месціцца ў галоўным "корпусе". Гэта – усхваленне жыцця ў Беларусі, і "лично" яе прэзідэнта. Якія эпітэты, якія фарбы! І, вядома, ні слова пра разгон Саюза пісьменнікаў, пра арышты, пра "хімію", стан беларускай мовы і школьніцтва...

Сумна ўсё гэта, сябры. Вось хто нас сапраўды дзеліць. Бо як жа аб'ядноўвацца з тымі, хто вядзе ўласны народ у тупік, уваскрашае дэманаў сярэднявечча...

Бедная, бедная Расія...

**Алег Аблажэй**

Блакітны агеньчык

# ГОРКІ – ГУЧЫЦЬ НЯРАДАСНА
## АЛЬБО ПІСЬМЕННІКІ І "ПРАДСТАЎНІКІ"

Калі ствараўся тэлеканал "Лад", меркавалася, што ён стане свайго роду заменай расейскаму каналу "Культура". Але ж цяпер на гэтым канале аддаецца перавага спартовым перадачам, а таксама бразільскім і расійскім серыялам, якія маюць толькі ўскоснае дачыненне да культуры. Аднак, "Лад" доўгі час заставаўся адзіным дзяржаўным тэлеканалам у Беларусі, дзе навіны йшлі па-беларуску. Цяпер, пасля чарговага рэфармавання, навіны з гэтага канала зніклі ўвогуле.

Сітуацыя амаль як у старым савецкім анекдоце. Глядач уключае тэлевізар і бачыць Брэжнева. Пераключае на другі канал – і там Брэжнеў. Пераключае на трэці, а там Андропаў ківае пальцам: "Я табе папераключаю"!

Таму з'яўленне на "Ладзе" новай перадачы "Слова пісьменніка" пакінула хоць прывідную надзею, што беларуская мова ў беларускім тэлеэфіры яшчэ канчаткова не памерла.




**«Хочам рознага!»** *21 лістапада адзначаецца Сусветны дзень тэлебачання. У Мінску адбылося некалькі нефармальных мерапрыемстваў, прысвечаных супрацоўнікам дзяржаўных тэлеканалаў. З прафесійным святам іх павіншавалі маладзёвыя актывісты. У прыватнасці, на станцыі метро «Усход» адбылася акцыя «Хочам рознага!», удзельнікі якой выставілі некалькі кардонных скрынак з налепленымі на іх «тэлеэкранамі». Фота: iniciative.org*

Рэкламная газетка "Ва-банк", прэзентуючы новую перадачу, адзначыла, што яе аўтары будуць імкнуцца даваць шырокую карціну "жизни литературы и ее представителей". Такі анонс, насамрэч, лепей падыйшоў бы да перадачы "У свеце жывёлаў". Але пакінем яго на сумленні газеты "Ва-банк".

У перадачу "Слова пісьменніка" былі запрошаныя некалькі літаратараў з Саюза пісьменнікаў Беларусі. А на мінулым тыдні яе госцяй стала вядомая паэтка Раіса Баравікова (яе асобу і творчасць згадваў у мінулым нумары "Свабоды" ў сваім палемічным эсэ Алег Аблажэй – рэд.). Размова вялася, у асноўным, сапраўды вакол паэзіі і творчасці маладых паэтаў. Але пад заслону вядучы – нехта Варахобін, задаў паэтцы пытанне: помнік якому з сучасных палітыкаў (!) яна хацела б бачыць? Баравікова далікатна абышла пытанне. Яна сказала, што хацела б бачыць у Мінску помнік Уладзіміру Караткевічу. А калі вядучы нагадаў, што помнік яму ўжо ёсць, здзівілася – а чаму б не паставіць яшчэ адзін, у сталіцы? А вось помнік Максіму Горкаму ў аднайменным парку ёй не падабаецца, бо псеўданім пралетарскага пісьменніка гучыць… неяк нярадасна.

Трэба аддаць належнае аўтарам перадачы – яны згадалі 75-годдзе паэта Анатоля Вярцінскага, якога грамадскасць віншавала на мінулым тыдні. Але запрасіць яго ў студыю "Лада" чамусці не здагадаліся, ці не захацелі. Мабыць, таму, што належыць Вярцінскі да Саюза беларускіх пісьменнікаў, які ўлада лічыць апазіцыйным.

Напэўна, стваральнікам "Слова…" давялося ісці шляхам выдаўцоў календара "Родны край" на 2007 год, які быў нядаўна выдадзены на беларускай мове тыражом 7 000 асобнікаў. У ім пазначаны дні нараджэння і смерці многіх літаратараў, якіх ужо… няма ў жывых. А таксама пазначаныя юбілеі старшыні СПБ Чаргінца і яго блізкага паплечніка, чыноўніка прэзідэнцкай адміністрацыі Скобелева. Імёнаў амаль нікога з сяброў Саюза беларускіх пісьменнікаў – у тым ліку класікаў беларускай паэзіі Барадуліна, Бураўкіна, Гілевіча – у календары вы не знойдзеце.

Так што ў новым годзе мы напэўна ўбачым на канале "Лад" новых дзеячоў літаратуры. Прынамсі, асобных прадстаўнікоў…

**Максім Пешкаў**

**МАТЭРЫЯЛЫ НЕЗАЛЕЖНАЙ ГАЗЕТЫ «СВАБОДА» ВЫ МОЖАЦЕ ЧЫТАЦЬ ТАКСАМА Ў ІНТЭРНЭЦЕ НА САЙЦЕ**

**VILNIA.COM**

**Заснавальнік** ТАА "Тут і цяпер"
**Галоўны рэдактар** А. Уласаў (email: gazeta@tyt.by)
**Адрас** 220013 г. Менск, пл. Каліноўскага, 1-а
**Тыраж** 299 экзэмпляраў